Reformation

# Першы фестываль беларускага сучаснага відэамастацтва прайшоў у Польшчы



КУЛЬТУРА

Фрагменты экспазіцыі выставы «Я ёсць працяты бусел». Фота: Леся Пчолка

Фестываль беларускага сучаснага відэамастацтва SAMASIEJ быў арганізаваны Цэнтрам беларускай культуры ў Беластоку ў супрацоўніцтве з мясцовымі і міжнароднымі партнёрамі. Ініцыятарам фестывалю стаў **Валентый Сельвясюк** – мецэнат і заснавальнік Mochnarte Foundation. Частка відэаработ былі створаны падчас рэзідэнцый у Мохнартэ: працы **Разаліны Бусел**, групы Bergamot, **Надзі Саяпінай, Юліі Цвятковай, Юры Шуста**.

Мэтай фестывалю было паказаць дынаміку сучаснай беларускай кул



задакументаваць змены, стымуляваць дыялог і знайсці адказ на пытанні: як выглядае сучаснае беларускае мастацтва, дзе мы і куды ідзём?




Фрагмент экспазіцыі выставы «Я ёсць працяты бусел». Фота: Леся Пчолка

Назва фестывалю SAMASIEJ паходзіць ад назвы рамана **Сакрата Яновіча** «Samosiej» 1981 года. Самасей – гэта расліна, якая вырастае самасевам, рэгенеруе і адраджаецца нават на кепскай глебе. Для арганізатараў фэсту гэта стала метафарай культуры, якая адраджаецца і квітнее нават у самых неспрыяльных умовах.

Куратар фэсту **Уладзімір Грамовіч** патлумачыў, што відэа-арт быў выбраны як найбольш даступны многім аўтарам спосаб паказваць мастацтва, якое здольнае пераадольваць адлегласці з дапамогай лічбавага фармату.

ru • en




Фрагмент экспазіцыі выставы «Я ёсць працяты бусел». Фота: Леся Пчолка

*«Відэа-арт – вельмі дэмакратычнае мастацтва*, — патлумачыў куратар. — *Тут не абавязкова быць рэжысёрам, можна здымаць і на тэлефон, і на вельмі прафесійную камеру. Мы відэа-арт кожны дзень можам бачыць у нашых тэлефонах. Цік-ток, інстаграм, рылс – гэта і ёсць у нейкім сэнсе відэа-арт – вельмі сучаснае медыя, і я не ведаю, што можа хутчэй, чым відэа, фіксаваць рэальнасць і ствараць мастацтва».*

Працы відэамастацтва адбіраліся згодна з ідэяй і канцэпцыяй выставы.

Галоўная выстава фестывалю адкрылася пад назвай «Я ёсць працяты бусел» (I Am Pfeilstorch) у будынку бібліятэкі і Цэнтра сучаснай адукацыі Беластоцкай політэхнікі. Працяты бусел – вобраз, напоўнены трагізмам і мужнасцю.

«Pfeilstorch» – з нямецкай мовы перакладаецца як «бусел са стралой». Т... называюць буслоў, параненых у Афрыцы дзідай або стралой, якія, нягледзячы на рану, усё ж вяртаюцца вясной у Еўропу на гнездаванне.

Першага і найбольш вядомага Pfeilstorch знайшлі ў 1822 годзе каля нямецкай вёскі Клюц. У яго шыі тырчала дзіда з Цэнтральнай Афрыкі. Птушку застрэлілі і захавалі з дапамогай таксідэрміі. Менавіта гэты Pfeilstorch стаў ключавым доказам таго, што птушкі здзяйсняюць доўгія сезонныя міграцыі. Да таго часу людзі верылі ў міфы: быццам птушкі зімой хаваюцца пад ваду або ператвараюцца ў іншых істот.




Фрагмент экспазіцыі выставы «Я ёсць працяты бусел». Фота: Леся Пчолка

*«У Беларусі бусел – нацыянальны сімвал. Як і ў Польшчы, ён з'яўляецца часткай ідэнтычнасці. У Францыі, у Эльзасе, таксама,* – паведамляе анатацыя выставы. – *На Падляшшы гэта распаўсюджаная, любімая птушка, якая канкуруе з вобразам зубра – другога моцнага сімвала рэгіёну. Кожны, хто вырас у Беларусі, ведае, што бусел – вобраз з дзяцінства: ён з'яўляўся ў*

*лагатыпе Беларускага тэлебачання, на самалётах Belavia (якія спынілі палёты ў 2021 годзе). Вобраз гэты пашырыў ураджэнец Гомельшчыны, беларускі манументаліст **Гаўрыла Вашчанка**. На яго карцінах, бадай, найбольш буслоў у беларускім савецкім мастацтве.*

ru • en

*Але ж бусел – гэта не толькі нашая птушка. Ён мігруе. Большасць года праводзіць у Афрыцы. Ён родны і для жыхароў Нігерыі, Чаду, Судану. Гэта мігрант, які выбірае больш спрыяльнае месца для сваіх дзяцей. І тым не менш, мы лічым яго сваім. Чаму?*

*Сёння жыццё, асабліва на Падляшшы, цячэ паміж дэмакратыямі, якія распадаюцца і знаходзяцца ў крызісе, і дыктатурамі, якія ўсё часцей нагадваюць пра сябе – паміж старым Берлінскім мурам і новай перашкодай, узведзенай у 2021 годзе паміж Беларуссю, Польшчай і Літвой. Міграцыйны крызіс, выкліканы дыктатурамі ў Беларусі і Расіі, азначае, што людзі з Афрыкі, Блізкага Усходу і іншых рэгіёнаў, ахопленых канфліктамі або нестабільнасцю, выцясняюцца ў Еўропу ў пошуках бяспекі, годнасці і найлепшага жыцця. Іх шлях поўны небяспекі: многія з іх апынуліся ў пастцы ў памежнай зоне, а часта людзі гінуць у лясах і балотах паміж агароджамі.*

*Беларускія палітычныя зняволеныя ўцякаюць рознымі шляхамі і таемнымі сцежкамі, шукаючы прыстанішча ад дыктатуры і турмы. І ўсё часцей яны паміраюць у краіне ці неўзабаве пасля вызвалення з турмы, у выніку цяжкіх праблем са здароўем, выкліканых гадамі пераследу і зняволення. Мігранты з розных рэгіёнаў перамяшчаюцца ў тым жа напрамку, шукаючы прытулак, часта затрымліваючыся ў памежных зонах. Іх падарожжы адлюстроўваюць адно аднаго.*

*Гледзячы ў неба апошнія чатыры гады, мы бачым, што над Беларуссю амаль не лятаюць пасажырскія самалёты. Над Падляшшам патрулююць толькі F-16 праз блізкасць мяжы, таму грамадзянскія самалёты ў асноўным*

*пазбягаюць гэтай паветранай прасторы, пакінуўшы ў шляху толькі буслоў, беспілотнікі і ваенныя самалёты. Нягледзячы на небяспеку, буслы вяртаюцца. Нягледзячы на раны, яны вяртаюцца ў гнёзды ў Беларусі, Украіне, Літве і Польшчы»*.



Такім чынам, выстава прысвечаная беларускам мастакам у эміграцыі, што займаюцца мастацтвам пасля 2020 года – таго пераломнага моманту, які падзяліў жыццё на «да» і «пасля». І фестываль спрабуе зафіксаваць гэтыя творчыя набыткі і тыя тэмы, якія мастакі падымаюць у сваіх праектах.

*«Мы ўсе ў пэўным сэнсе – «Pfeilstorch» – буслы са стрэламі. Мы лётаем, несучы свае раны, шукаючы кірунак у новых кантэкстах, будуючы новыя дамы, інтэгруючы эміграцыю ў нашае паўсядзённае жыццё»,* – мяркуе куратар фэсту Уладзімір Грамовіч.

Што ж адбывалася падчас фестывалю, які працы найбольш уразілі гледачоў, якія аўтары закранулі найбольш вострыя і балючыя тэмы?

Уладзімір Грамовіч адзначае, што гледачы былі моцна ўражаны стужкай **Рамана Шэля** «Апошнія словы», прысвечанага памерламу ў турме мастаку і палітзняволенаму **Алесю Пушкіну**. *«У фільме перасякліся многія рэчы, якія закранаюць іншыя аўтары ў сваіх працах*, – сказаў куратар. – *І галоўная ідэя пра тое, што мастацтва з'яўляецца нашым полем бою, часта – адзіна магчымым*».

Тэмы, якія закраналі аўтары, тычыліся вайны, рэпрэсіяў, сённяшняй сітуацыі нестабільнасці. Пераканальна і адначасова абстагавана стан няпэўнасці увасобіўся ў відэа групы Bergamot. Прадмет, створаны для падтрымання раўнавагі, – каромысла – становіцца рэччу максімальна няўстойлівай. Праца даследуе дэканструкцыю цэнтра і роўнасць у кадры чалавека, прадметаў і краявіду.

**Юлія Цвяткова**, маючы адукацыю ў галіне мікрабіялогіі і выяўленчага мастацтва, у сваіх працах спалучае навуковае назіранне з паэтыкай. У відэа, паказаным на фестывалі, кадры хронікі чаргуюцца з містычнымі сцэнамі, актуалізуючы жаданне скарыстацца магічнымі сіламі, каб пераадолець такія фізічныя бар'еры, як мяжа.



**Надзя Саяпіна** ў сваім творы разважае пра паняцце покуці і апісвае стан мігрантаў, якія не могуць знайсці свайго кута.



Фрагмент экспазіцыі выставы «Я ёсць працяты бусел». Фота: Леся Пчолка

**Разаліна Бусел** у відэа «Фальшывае неба / Сапраўднае неба» параўноўвае сімволіку дзяржаўнай мяжы і пахавальных рытуалаў. Неба ў рэлігійным кантэксце — сімвал паасобнага свету, а рухомае «фальшывае неба» інсцэніруе пераход паміж Беларуссю і Польшчай. Воблакі цямнеюць, ствараючы трывожную глыбіню, а сапраўднае неба адкрываецца як кароткая надзея на будучыню. Даследуючы мяжу паміж рэальным і нерэальным, яна паказвае розныя вобразы неба, якія добра стасуюцца да

канцэпцыі выставы. *«Канцэпцыя выставы звязана з пусткай, а мы ведаем, што зараз у беларускім небе праз мяжу не лётаюць самалёты, і ў Падляшшы, дзе праходзіць выстава і было створана гэта відэа, іх няма, хіба што дроны расійскія ды пералётныя птушкі можна ўбачыць у небе»*, – тлумачыць куратар Уладзімір Грамовіч.

Праца **Лесі Пчолкі** даследуе сувязь паміж містычнымі рытуаламі і палітычным ціскам, яна звязаная з падзеямі беларускай рэвалюцыі 2020 года. Голас артысткі шэпча старажытную замову дзеля таго, каб пераадолець траўму.

Праца **Дашы Сазановіч** разглядае каўтун са зблытаных валасоў як метафару калектыўнага страху і супраціву. Каўтун становіцца бачным вузлом таго, пра што немагчыма распавесці: прыгнёту, цяжкасцяў, духоўнага выкаранення. Гэта адначасова папярэджанне і дабраславенне, напамін пра сувязь з прыроднымі і старажытнымі сіламі.

«Čornaja poliŭka» **Тані Лічэўскай** – відэа пра тое, як галодны «госць» урываецца ў тваю прастору – метафара імперскага апетыту, падмацаванага гісторыяй «войнаў за вызваленне» і «міратворчых аперацый». Падставай стаў уласны досвед мастачкі: напамін пра Лунінецкі вайсковы аэрадром, які быў актываваны ў 2022 годзе для нападаў на тэрыторыю Украіны. Čornaja poliŭka – традыцыйная беларуская страва з крыві гусі ці свінні, якой у мінулым ветліва адмаўлялі сватам. Тут яна становіцца сімвалам адмовы прыняць нязванага госця.

**Марыі Немчанка Аржаніч** (Літва) паказала частку вялікага праекта, які даследуе міграцыйныя шляхі птушак з Літвы праз Палестыну і Ліван у Судан, эксперыментальны дакументальны фільм пра сувязь чалавека і птушак, захапленне міграцыяй і парадаксальнае жаданне яе

нацыяналізаваць. Праз гісторыі пра буслоў, міграцыю, радзіму і ўзаемазалежнасць відэа становіцца прасторай для абмену ведамі і роздуму.

**Ганна Панюціч** распавядае гісторыю пошуку знака радыеактыўнасці ў Мінскай вобласці, дзе шмат тэрыторый было забруджана. Відэа складаецца з кадраў, знятых на працягу аднаго дня ў Беларусі, і архіўных матэрыялаў. У ім можна пабачыць краявіды, вельмі тыповыя для Беларусі: палі бульбы і кукурузы, лясы, вясковыя дамы. Некаторыя з гэтых участкаў былі ачышчаны, але ў іншых радыяцыя засталася глыбока ў глебе і распаўсюджваецца праз карані гародніны.

Фатограф і візуальны мастак з Польшчы **Тытус Шабельскі-Ружняк** даследуе дзяржаўныя і капіталістычныя інфраструктуры, аналізуючы іх як карты ўлады, ідэалогіі і схаванага гвалту. У сваім відэа ён паказвае інфраструктуры, створаныя, каб спрыяць руху транспарту, і адначасова тыя, якія прызначаны блакаваць яго. Гэтыя дзве функцыі становяцца часткай супольнай сістэмы, якая кіруе нашым перамяшчэннем.

Куратар **Уладзімір Грамовіч** паказаў на фэсце свой твор «Апошняя пастараль», які фіксуе рэстаўрацыю ім помніка, пастаўленага на мяжы вёскі. Помнік быў знойдзены ў 2020 годзе за тыдзень да выбараў непадалёк ад Беластока. На ім – малітва з просьбай збавіць ад атамнай вайны. Камера фіксуе, як мастак дабаўляе чорную фарбу ў выбітыя літары. Нечакана пагроза сталася актуальнай…

Фестываль беларускага сучаснага відэамастацтва плануецца зрабіць рэгулярным.